чоў. Тут студэнт лепш адаптуецца да атрымліваемай прафесіі. Раней практычныя заняткі па бібліяграфічнаму краязнаўству праводзіліся ў абласной бібліятэцы імя А.С.Пушкіна і ЦБ імя Я.Купалы. Цяпер бібліятэкі неахвотна прымаюць студэнтаў для правядзення заняткаў на грамадскіх пачатках. Рыначныя адносіны і інфляцыйныя працэсы парушылі таксама кантакты спецыяльных кафедраў з бібліятэкамі ў рамках вучэбна-навукова-вытворчых комплексаў. Трэба шукаць новыя магчымасці сувязей з бібліятэкамі, у тым ліку ў рамках сумесных навуковых даследаванняў.

Адной з важных праблем на сягоняшні дзень у выкладанні спецыяльных дысцыплін з'яўляецца недастатковае інфармацыйнае забеспячэнне педагогаў, па-першае, навуковымі, тэарэтычнымі, вучэбна-метадычнымі матэрыяламі з краін блізкага і далёкага замежжа; падругое, матэрыяламі аб практычнай дзейнасці бібліятэк і бібліяграфічных устаноў. У сувязі з палітычнымі і эканамічнымі зменамі ў рэспубліцы мяняюцца функцыі бібліятэк, змест і тэхналогія іх працы. Між тым іх краязнаўчая дзейнасць, часта разнастайная і цікавая, нідзе не асвятляецца і не даступна ні выкладчыку, ні студэнту. Асабліва гэта тычыцца мясцовых бібліятэк. Але прафесійнага часопіса ў Беларусі мы не маем. Раней дапамагала ў зборы мясцовага матэрыялу выязная практыка студэнтаў у абласныя і раённыя бібліятэкі. Цяпер і такі канал неэфектыўны, таму што вытворчая практыка праводзіцца толькі ва ўстановах горада Мінска.

Неабходна выданне падручніка, які б адлюстроўваў беларускую спецыфіку. Улічваючы ўвядзенне ў 1995/1996 навучальным годзе курса па бібліятэчнаму і бібліяграфічнаму краязнаўству, падручнік па зместу таксама павінен быць комплексным.

Праводзіцца пастаянная работа па ўдасканальванню методыкі лабараторных і семінарскіх заняткаў, кантролю за самастойнай працай студэнтаў. Каб студэнты маглі працаваць з цікавасцю, прымяняецца, у прыватнасці, так званы "земскі" прынцып пры размеркаванні заданняў па складанню краязнаўчых картатэк, бібліяграфічных аглядаў, напісанню рэфератаў. Усе гэтыя заданні кожны студэнт мае магчымасць выконваць на матэрыяле свайго роднага краю.

Адчуваецца, што больш увагі трэба аддаваць набыццю студэнтамі ўменняў пры ажыццяўленні розных тэхналагічных працэсаў, у тым ліку цераз авалодванне камп'ютэрнай тэхнікай.

Зыгмантовіч С.В.,
канд.пед.навук,
дацэнт

## ТЭХНАЛАГІЧНАЯ ПАДРЫХТОЎКА СТУДЭНТАЎ ЯК ПРЫЯРЫТЭТНЫ НАКІРУНАК ПРЫ ВЫКЛАДАННІ КУРСА "АРГАНІЗАЦЫЯ І МЕТОДЫКА БІБЛІЯГРАФІЧНАЙ РАБОТЫ Ў БІБЛІЯТЭЦЫ"

Бібліяграфічная падрыхтоўка бібліятэкараўбібліёграфаў да 1986 года ажыццяўлялася на базе адзінай вучэбнай дысцыпліны "Агульная бібліяграфія". Развіццё бібліяграфазнаўства як навукі, рост яго навуковага і практычнага патэнцыялу, дыферэнцыяцыя ведаў прывялі да выдзялення вучэбных дысцыплін па аспектных раздзелах бібліяграфазнаўства, такіх як "Тэорыя бібліяграфіі", "Гісторыя бібліяграфіі", "Арганізацыя і методыка бібліяграфічнай работы ў бібліятэцы" (АМБР). Адной з актуальных праблем для выкладання гэтых дысцыплін, у тым ліку і для галіновых бібліяграфій, з'яўляецца ўвядзенне ў навуковы і вучэбны абарот бібліяграфічнай тэхналогіі.

На сённяшні дзень у бібліяграфазнаўстве адсутнічае самастойнае вучэнне аб бібліяграфічнай тэхналогіі. Але ў спецыяльным друку амаль у кожным артыкуле мы знойдзем ужыванне тэрміна "тэхналогія" ("тэхналогія складання бібліяграфічнага апісання", "тэхналогія работы з рэкамендацыйнымі бібліяграфічнымі дапаможнікамі", " тэхналогія рэдагавання" і інш.). Знойдзем таксама меркаванне навукоўцаў зусім супрацьлеглага характару: ад аб неабходнасці чытання самастойнага курса "Бібліяграфічная тэхналогія" да думкі, што паняцце "бібліяграфічная тэхналогія" немэтазгодна прымяняць як самастойнае, таму што яно ўваходзіць у паняцці "бібліятэчная тэхналогія" і "інфармацыйная тэхналогія". Таму і паўстаюць пытанні: што адносіцца да бібліяграфічнай тэхналогіі, як яна суадносіцца з методыкай бібліяграфічнай работы, тым больш, што ў бібліяграфічнай практыцы паняцці "ме-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тодыка" і "тэхналогія" шырока ўжываюцца як сінонімы.

При выкладанні курса АМБР мы прытрымліваемся наступнага погляду на гэтыя паняцці.

Методыка тлумачыць, як, якім чынам вырашыць канкрэтную задачу, якіх правіл патрэбна прытрымлівацца. Яна засноўваецца на тэарэтычных ведах, навыках і уменнях, атрыманых у працэсе работы. Яе мэта -- даць правільныя ўстаноўкі, раскрыць складанасці ў рабоце. Складаючымі элементамі методыкі выступаюць метад, метадычнае рашэнне, метадычны савет, прыём. Вынікам методыкі з'яўляецца замацаванне атрыманага вопыту, стварэнне перадумоў для яго выкарыстання, распаўсюджванне найбольш эфектыўнага варыянта з усіх магчымых і існуючых на практыцы.

Тэхналогія дае адказ на пытанні: што рабіць? чым рабіць? і што ў выніку трэба атрымаць? Тут галоўнае ведаць, што трэба пераўтварыць, у якой паслядоўнасці, якіх вынікаў і пры якіх умовах работы можна дасягнуць, як паступаць пры альтэрнатыўных варыянтах. Складаючымі элементамі тэхналогіі з'уляюцца тэхналагічны працэс, аперацыя, тэхналагічнае рашэнне, прыём.Вынікам тэхналагічнага працэсу з'яўляецца канкрэтны бібліяграфічны прадукт ці паслуга.

Лічыцца, што тэхналогія мае права на існаванне, самавызначэнне пры наяўнасці свайго прадукта і метадаў пераўтварэння.

У дакументаграфічнай канцэпцыі А.П.Коршунава, якая ляжыць па сутнасці ў аснове выкладання бібліяграфазнаўчых курсаў, выдзяляюцца два бібліяграфічных працэсы: бібліяграфаванне і бібліяграфічнае абслугоўванне; выдзяляюцца бібліяграфічныя метады: метад бібліяграфічнага згортвання, метад ідэнтыфікацыі дакумента, абвяшчэння аб дакуменце і г.д. У альтэрнатыўнай праграме курса "Тэорыя бібліяграфіі", падрыхтаванай М.Г.Вохрышавай, акрамя названых бібліяграфічных працэсаў, выдзяляюцца таксама: бібліяграфічнае навучанне работнікаў бібліятэкі; кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю; бібліяграфічныя зносіны. На наш погляд, бібліяграфічнае навучанне чытачоў трэба разглядаць таксама як самастойны працэс.

Вынікам ажыццяўлення бібліяграфічных працэсаў з'яўляюцца бібліяграфічныя прадукты (бібліяграфічныя дапаможнікі, пісьмовыя тэматычныя даведкі і агляды, бюлетэні новых паступленняў і г.д.) і паслугі (вусныя бібліяграфічныя агляды і бібліяграфічныя даведкі, дні бібліяграфіі, кансультацыі і інш.).

Такім чынам, існуюць бібліяграфічныя працэсы, метады, вынікі бібліяграфічнай дзейнасці, і, безумоўна, існуе бібліяграфічная тэхналогія як самастойная з'ява.

Аналіз зместу курса АМБР сведчыць аб тым, што ў аснове яго ляжыць тэхналагічны падыход да раскрыцця зместу бібліяграфічнай дзейнасці. Раздзелы курса (ДБА бібліятэкі; методыка бібліяграфавання; бібліяграфічнае абслугоўванне; бібліяграфічнае навучанне чытачоў і работнікаў бібліятэкі; кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю) у асноўным адпавядаюць тым працэсам, якія выдзяляюцца ў сучасным бібліяграфазнаўстве.

Тэхналагічны падыход характэрны і для раскрыцця зместу гэтых раздзелаў. Пры выкладанні ўвага студэнтаў звяртаецца на сутнасць працэсу; робяцца спробы даць алгарытмічнае, аперацыйнае апісанне тэхналагічнага працэсу, падрыхтоўкі розных бібліяграфічных прадуктаў і паслуг; паказаць, якімі нарматыўнымі і метадычнымі матэрыяламі забяспечаны гэтыя працэсы; хто іх у бібліятэках выконвае; раскрыць асаблівасці іх ажыццяўлення ў бібліятэках розных тыпаў і з выкарыстаннем розных матэрыяльна-тэхнічных магчымасцей і сродкаў; раскрыць напрамкі, метады і паказчыкі вывучэння эфектыўнасці і якасці названых працэсаў.

Улічваючы гэтыя асаблівасці выкладання курса АМБР, трэба адзначыць неабходнасць удакладнення яго назвы і змены яе на "Арганізацыю і тэхналогію бібліяграфічнай работы ў бібліятэцы".

Тэхналагічны падыход да выкладання курса ставіць выкладчыка перад шэрагам цяжкасцей: адсутнасць грунтоўных тэарэтычных распрацовак, тэрміналагічная недасканаласць, адсутнасць нарматыўнай і тэхналагічнай дакументацыі. Кожны выкладчык пачынае самастойна распрацоўваць аперацыйна-тэхналагічныя схемы вытворчасці розных бібліграфічных прадуктаў і паслуг. Гэтай жа работай сёння займаюцца і практычныя бібліятэчныя работнікі. У сувязі з гэтым было б мэтазгодна стварэнне адзінага банка ці зборніка нарматыўных і рэгламентуючых дакументаў, якія сёння функцыяніруюць у бібліятэках рэспублікі, што дало б магчымасць выкарыстоўваць іх у вучэбных мэтах і ў практыцы бібліятэк.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спецыяльная адукацыя павінна мець апераджальны характар, гэта значыць, што ўжо сёння студэнты павінны мець навыкі працы ва ўмовах аўтаматызаванай тэхналогіі. Пераважна прыкладная, практычная накіраванасць курса АМБР дае магчымасць выкладаць, абучаць студэнтаў навыкам бібліяграфічнай дзейнасці, заснаванай і на ручной тэхналогіі, і з выкарыстаннем ЭВМ. Неабходнасць такога паралельнага выкладання дыктуюць аб'ектыўныя ўмовы: неабходнасць суіснавання яшчэ доўгі час як камп'ютэрнай, так і традыцыйнай тэхналогіі бібліяграфічных працэсаў у рэальнай практыцы бібліятэк; не ўсе аперацыі асобных бібліяграфічных працэсаў сёння можна аўтаматызаваць; паралельнае існаванне як традыцыйных, так і нетрадыцыйных носьбітаў бібліяграфічнай інфармацыі і г.д. Пры выкладанні разглядаемага курса робяцца пэўныя намаганні, каб рэалізаваць менавіта такі падыход. Для далейшага ўдасканалення тэхналагічнай падрыхтоўкі студэнтаў пры вывучэнні курса АМБР патрэбны распрацоўка і набыццё навучальных праграм, вучэбных матэрыялаў, метадычных распрацовак, накіраваных на фарміраванне навыкаў студэнтаў па ажыццяўленню розных бібліяграфічных працэсаў з выкарыстаннем ЭВТ; набыццё ўжо створаных рэспубліканскімі бібліятэкамі і Кніжнай палатай баз даных; вывучэнне вопыту выкладання ва ўмовах новых тэхналогій у іншых ВНУ культуры.

Чаплыгіна Т.Л.,
ст.выкладчык

## ВЫКАРЫСТАННЕ МЕТАДАЎ І ФОРМ РАБОТЫ БІБЛІЯТЭК ПА НАЦЫЯНАЛЬНАМУ АДРАДЖЭННЮ Ў КУРСЕ "АРГАНІЗАЦЫЯ, ЭКАНОМІКА, КІРАВАННЕ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВАЙ"

Наша сучаснае палітычнае і эканамічнае жыццё характарызуе нестабільнасць. Міжволі пачынаеш задумвацца над тым, ці ёсць у нашай дзяржаве тая апора, што не дасць скарыцца лёсу, які не надта быў міласэрны заўсёды для Белай Русі. Гэтую апору многія бачаць у нацыянальным адраджэнні. А для гэтага трэба, каб усё, што складае наша жыццё, было напоўнена адзіным вялікім імкненнем кожнага чалавека адчуваць сябе неад'емнай часцінкай менавіта гэтай дзяржавы, гэтай зямлі. Свая сцяжынка ў гэтай справе ёсць у бібліятэках РБ. Работа іх накіравана на тое, каб даць магчымасць кожнаму чытачу спасцігнуць светапогляд і душу свайго народа, яго добразычлівасць і мудрасць, яго сардэчнасць, таленавітасць і майстэрства.

Адна з праблем, над якой працуюць калектывы бібліятэк, -- выхаванне чытачоў на народных традыцыях роднага краю.

У бягучым годзе былі аформлены кніжныя выставы і паліцы, праводзіліся па іх агляды: "Цвіці, каласіся, мой край беларускі", "Ваш сябар -- беларуская кніга", "З цэлым народам гутарку весці", "Гучы, беларуская мова", "Славутыя палачанкі" і інш. Гэта і выкарыстоўвалася на занятках па аналізу работы бібліятэк.

Абмеркаванне канкрэтнага матэрыялу, які адлюстроўвае вопыт работы бібліятэк, дазваляў наблізіць навучанне да практычных задач, актывізаваць абмен вопытам і ведамі. Ва ўсіх вучэбных групах адбыліся заняткі, на якіх абмяркоўвалася дзейнасць фальклорна-этнаграфічнага гуртка "Пралескі" (СШ N 163 г.Мінска), клуба "Пошук" (Мазырская ЦРБ).

Важным метадычным фактарам у арганізацыі заняткаў у форме аналізу і абмеркавання дакумента з'яўляецца тое, што студэнтам прапануецца выканаць дакладнае, маючае практычную накіраванасць заданне: вывучыць, прааналізаваць, абмеркаваць дадзены матэрыял, зрабіць вывады, даць свае рэкамендацыі.

На гэтых занятках выкарыстоўваліся гадавыя планы работы бібліятэк РБ, планы работы методыка-кансультацыйных цэнтраў, сцэнарый конкурснай праграмы прафесійнага майстэрства на званне "Лепшы бібліятэкар года", матэрыялы дзелавой гульні "Удасканальваем майстэрства", семінара-практыкума "Шляхам адраджэння", конкурсаў-аглядаў і інш.

Ад студэнтаў патрабуецца вылучэнне станоўчых і адмоўных бакоў у прааналізаваным матэрыяле, правядзенне параўнанняў і абагульненняў. Гэта садзейнічае ўдасканаленню навыкаў аналітычнага мыслення, уменню выкарыстоўваць інфармацыю.

Падрыхтоўка і распрацоўка такіх заняткаў патрабуе ад выкладчыка вялікай падрыхтоўчай работы. Неабходны своечасовы падбор матэрыялу, яго апрацоўка, размнажэнне, распрацоўка дакладнага плана заняткаў і метадычных указанняў у дапамогу студэнтам.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ